Однако для предмета «Иностранный язык» практика использования компьютерных технологий в процессе обучения учащихся не является развитой, а создание и внедрение обучающих компьютерных программ остаются достаточно узкими, несмотря на то, что персональный компьютер пригоден для обучения любым видам речевой деятельности и аспектам языка.

Широкое внедрение обучающих компьютерных программ в образовательный процесс учреждений общего среднего образования по предмету «Иностранные языки», на наш взгляд, поможет создать инновационные условия практических занятий по обучению иностранному языку. Это, в свою очередь, будет способствовать эффективному решению одной из важных задач практических занятий по иностранному языку: формированию общей коммуникативной компетенции.

Учебный текст обучающей компьютерной программы – это главное информационное поле. Оно содержит тот материал, который воспринимается обучаемым за один прием, осознается им и сохраняется в оперативной, а затем – и в долговременной памяти. Лингвистический текст обучающей компьютерной программы может:

– содержать известные элементы (позволяющие учащимся соотносить содержание с их собственным опытом) и неизвестные элементы, стимулирующие их любопытство;
– помогать школьникам больше узнать о будущей профессиональной деятельности;
– и должен соответствовать языковой подготовке учащихся;
– подходить для реализации поставленных задач;
– быть адаптированным;
– быть кратким.

При использовании компьютерных программ в образовательном процессе детей школьного возраста необходимо осуществлять зрительную выразительность текста, то есть в тексте могут содержаться пояснения в виде схем и таблиц. Тексты обучающих компьютерных программ служат для обучения чтению, переводу, говорению, аудированию и являются средством представления новой лексики и грамматики в контексте ее употребления.

Таким образом, реализация, рассмотренных выше, аспектов модернизации обучения иностранному языку в учреждениях общего среднего образования будет обеспечивать повышение эффективности его преподавания.

**Литература**

1. Копылова, В. В. Основные направления организации обучения иностранным языкам при проведении эксперимента по совершенствованию структуры и содержания общего образования / В. В. Копылова // Коммуникативная методика, 2003. – № 3. – С. 15–20.

2. Пальцева, Т. И. Использование страноведческого материала в обучении английскому языку в 5–6 классах средней общеобразовательной школы: автореф. … дис. канд. пед. наук; 13.00.02 / Т. И. Пальцева. – Петрозаводск, 1997. – 175 с.

**УДК 398:7.091.4(476)**

***В. В. Гардзей***

## ФЕСТЫВАЛЬ ФАЛЬКЛОРНАГА МАСТАЦТВА «БЕРАГІНЯ»: АРГАНІЗАЦЫЯ, ЗМЕСТ І ФОРМЫ СВЯТОЧНЫХ ІМПРЭЗ

*Артыкул прысвечаны фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», які праводзіцца ў г.п. Акцябрскі Гомельскай вобласці кожныя два гады. У даследаванні дадзена агульная характарыстыка правядзення фестывалю. Артыкул змяшчае звесткі пра яго ўзнікненне і развіцце. Найбольш дакладна разгледжаны пытанні, якія датычацца зместу, арганізацыі і формаў правядзення заключных мерапрыемстваў.*

На працягу года ў розных кутках Беларусі праходзяць шматлікія фестывалі і святы. Сярод іх – знакамітыя музычныя і тэатральныя форумы, фестывалі народнай культуры і рамёстваў. Асобнае месца ў шэрагу разнастайных урачыстых мерапрыемстваў займае фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня», які праводзіцца ў г. п. Акцябрскі з 1998 г. кожныя два гады.

Фестываль «Берагіня» дынамічна развіваецца, з кожным крокам уключае ў свае імпрэзы ўсё новыя віды і жанры матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны і прыцягвае да сябе ўсё больш моладзі. Яго унікальнасць заключаецца ў тым, што ён будуецца на прынцыпах этнапедагогікі і з'яўляецца эталонам падыходаў да захавання і трансляцыі падрастаючым пакаленням розных відаў і праяў лакальнай культурнай спадчыны. Таму мэта дадзенага даследавання – вызначыць асноўны змест, арганізацыю і формы правядзення фестывалю, асноўныя крыніцы – уласны вопыт аўтара, фотаматэрыялы, інтэрв'ю з удзельнікамі свята.

Гісторыя мерапрыемства, якое атрымала назву «Берагіня», пачынаецца з правядзення першага фестывалю ў 1998–1999 гг. у межах невялікага рэгіёна. Аднак падрыхтоўка да правядзення фестывалю пачалася значна раней з даследавання і вывучэння народнай культуры Акцябршчыны. Другі фестываль, які адбыўся ў 2001 г., ахапіў Гомельскую вобласць. У 2004 г. фестываль набыў статус рэспубліканскага. У 2014 г. рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» праходзіў у г. п. Акцябрскі ў восьмы раз. Аўтарам ідэі і мастацкім кіраўніком святочнага мерапрыемства з'яўляецца М. А. Козенка.

Асноўнай мэтай фестывалю з'яўляецца падтрымка народнай творчасці, захаванне рэгіянальнай традыцыйнай культуры, а таксама далучэнне моладзі да культуры свайго краю. Калі звярнуцца да вытокаў, «Берагіня» – знак, які выкарыстоўваўся ў традыцыйнай беларускай вышыўцы як сімвал жанчыны, сям'і, сімвал, які захоўвае і аберагае. Таму нездарма, што ён быў абраны эмблемай фестывалю.

Фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» ладзіцца ў чатыры этапы на працягу двух гадоў. Першы этап праводзіцца на ўзроўні мясцовых мерапрыемстваў і уключае фальклорныя экспедыцыі, даследаванне і вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны свайго краю, стварэнне фальклорных калектываў, навучанне дзяцей і моладзі народным відам мастацтва. Другі этап праводзіцца ўжо на аснове раённых і гарадскіх мерапрыемстваў і ўключае ў сябе правядзенне конкурсаў і турніраў паміж удзельнікамі. Трэці этап праводзіцца на абласным узроўні.

Чацвёрты этап прадстаўляе сабой рэспубліканскія заключныя мерапрыемствы фестывалю, у якіх прымаюць удзел пераможцы трэцяга этапу. Фінал праводзіцца чатыры чэрвеньскія дні ў г. п. Акцябрскі. На некалькі дзён жыццё ў гэтым населеным пункце пераўтвараецца ў сапраўднае свята.

Тры дні праводзяцца конкурсы і турніры паміж дзіцячымі і маладзёжнымі фальклорнымі калектывамі, якія ўдзельнічаюць у наступных праграмах: харэаграфічнае мастацтва, музычнае мастацтва, народная проза і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Праграма «Харэаграфічнае мастацтва» складаецца з трох намінацый: «Карагод», «Кадрыля» і «Конкурс танцавальных пар – выканаўцаў народных побытавых танцаў». Удзельнікі конкурсу выконваюць мясцовыя варыянты парных

танцаў: «Лявоніха», «Полька імправізаваная», «Мікіта», полька «Бабачка», «Кракавяк», «Падыспань», «Какетка», «Субота» і інш.

Праграма «Музычнае мастаства» складаецца з двух намінацый: «Народныя спевы» і «Інструментальная музыка».У намінацыі «Народныя спевы» кожны фальклорны калектыў выконвае дзве песні мясцовай традыцыі. У намінацыі» Інструментальная музыка» ўдзельнікі выконваюць перанятыя ад мясцовых народных музыкаў традыцыйныя найгрышы на беларускіх народных музычных інструментах.

Праграма «Народная проза» складаецца з трох намінацый: «Твор народнай прозы» (казка, легенда, паданне); «Скарагаворка» і «Імправізацыя на зададную казкавую тэму». Заданне ў апошняй вызначаюць арганізатары турніру перад пачаткам выступлення, напрыклад: «Жылі былі дзед і баба…» Далей выступоўца спантанна павінен стварыць самастойны варыянт казкі.

Праграма «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» складаецца з трох частак – «хатняга задання», прэзентацыі «хатняга задання» і адкрытых конкурсаў, якія праводзяцца адначасова. Хатняе заданне – выстаўка-конкурс вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, на якую прадстаўляюцца калекцыі ці асобныя вырабы – лялькі ў этнічных касцюмах, вышыўка, карункапляценне, ткацтва, вырабы з прыродных матэрыялаў, ганчарства, разьба па дрэве, выцінанка. Выстаўка прэзентуецца ў мастацкай форме аўтарамі твораў. Адначасова праводзіцца адкрыты конкурс на лепшы выраб з саломы, з прыродных матэрыялаў, выраб пояса, разьба па дрэве [1, с. 128].

Падчас правядзення конкурсных мерапрыемстваў удзельнікі фестывалю прымаюць удзел у шэсці-відовішчы. У час шэсця калектывы прэзентуюць «візітоўку». Кожны калектыў павінен мець сваю эмблему. Той калектыў, які найбольш адметна праявіў сябе, заахвочваецца дыпломам і падарункамі.

Адбываюцца конкурсы на лепшае падвор'е, кірмашы народных умельцаў і разнастайныя майстар-класы па пляценню паясоў, лепцы з гліны, лозапляценню, саломапляценню, разьбе па дрэве і інш. На кірмашах кожны можа адведаць розныя народныя стравы, набыць прыгожыя мастацкія творы і сувеніры, паўдзельнічаць у гульнях пэўнай мясцовасці.

Пасля заканчэння конкурсных мерапрыемстваў рэканструкцыя беларускага каляндарнага свята Купалле становіцца адной з асноўных падзей фестывалю. Ужо традыцыйна асноўнымі элементамі рэканструкцыі свята сталі пляценне вянкоў, Купальскае шэсце, Купальскі карагод і «Фальклорная танцаманія». На падыходзе да возера ўсе праходзяць праз сімвалічную браму з ачышчальным купальскім агнём. Вакол вогнішча спяваюць купальскія песні і водзяць карагоды. Разам з удзельнікамі фальклорных і танцавальных калектываў, у танцавальны марафон актыўна ўключаюцца мясцовыя юнакі і дзяўчаты, госці, для многіх з якіх ён становіцца першым далучэннем да народных вытокаў.

У апошні дзень падводзяцца вынікі: ўдзельнікі і пераможцы фестывалю ўшаноўваюцца адпаведнымі дыпломамі і прызамі. Па выніках конкурсных праграм і асобных намінацый удзельнікам фестывалю надаюцца званні: «Лаўрэат» за першае месца і «Дыпламант» за другія і трэція месцы. Дзіцячаму фальклорнаму калектыву і салісту, якія атрымалі найбольшую колькасць першых месцаў у конкурсных праграмах і намінацыях фестывалю, прысуджаецца «Гран-пры». «Круглы стол» абагульняе вопыт усяго мерапрыемства.

Варта падкрэсліць, што фестываль «Берагіня» – гэта не проста чатыры дні заключных імпрэз, якія праходзяць у г. п. Акцябрскі. Гэта вялікая навуковая і даследчая праца па вывучэнню традыцыйнай культуры сваёй мясцовасці, якая праводзіцца ўдзельнікамі на працягу двух гадоў. Галоўная заслуга фестывалю

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

фальклорнага мастацтва «Берагіня» ў захаванні і трансляцыі народных традыцый беларусаў.

### Літаратура

1 Козенка, М. А., Берагіня: Шосты рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва / М. А. Козенка – Мінск: Чатыры чвэрці, 2010. – 184 с.

**УДК 94(47+57): 338.245 «1960/1980)**

***Э. Л. Гарцуев***

## ВОЕННО-ПРОМЫШЛЕННЫЙ КОМПЛЕКС СССР В 1960–1980-х гг.

*Статья посвящена развитию экономики СССР в годы брежневского «застоя». В статье рассмотрено функционирование ВПК в рамках советского государства. Рассмотрена также государственная политика которая проводилась в области военной промышленности. Исследованы факторы, способствовавшие повышению боеспособности вооруженных сил страны.*

После прихода к власти нового руководства во главе с Л. И. Брежневым были предприняты попытки придать советской экономике новое дыхание. Несмотря на определенные изменения в экономики развитие советской экономики проходило под четким надзором партии и правительства. В экономическом развитии страны можно выделить некоторые недостатки: превалирование административных мер в управлении народным хозяйством над экономическими, ограничение прав предприятий.

Быстрые темпы экономического роста, характерные для 1930–1950-х годов, сменились периодом постепенного замедления прироста производительности по мере того, как сокращался разрыв уровня жизни с развитыми капстранами. Это было связано с исчерпанием потенциала для роста и снижением предельной отдачи по народному хозяйству в результате накопления основных фондов.

Одной из основных составляющих экономики СССР был военно-промышленный комплекс. Ускорению развития экономики СССР, помимо той политики которая проводило руководство страны, мешал гипертрофированный ВПК.

Военно-промышленный комплекс СССР – постоянно действовавшая система взаимосвязей субъектов экономической и социально-политической структуры советского общества, связанных с обеспечением военной безопасности СССР. Он сформировался в послевоенные годы, в условиях холодной войны.

Специфика ВПК заключается в особенностях организационной структуры предприятий и организации комплекса, отличающих их от традиционных товаропроизводителей, действующих в экономической сфере. Среди них правомерно выделить следующие: заказчик военной продукции – государство, причем существует определенная, на практике ограничиваемая наличием мирового рынка вооружения и военной техники монополия заказчика, обусловленная преобладанием государственного заказа на создание и производство вооружение над инициативами работников предприятий ВПК; особые требования качеству производимой продукции, которые могут превосходить или уступать аналогичным стандартам ,определяющим качество гражданской продукции; наукоемкость  и высокотехнологичность разработки производства видов вооружений; наличием избыточных мощностей, запасом дефицитного сырья, оборудование; высокий уровень специализации и монополии производителей.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ